ялагічных праграм у прамым эфіры, якія задавальнялі патрэбу слухачоў у інтэрактыўнасці.

Менавіта такія падзеі і працэсы папярэднічалі з’ўленню ў студзені 2002 новай радыёстанцыі – «Культура», у аснову канцэпцыі якой была пакладзена папулярызацыя найлепшых дасягненняў сусветнай і нацыянальнай культуры. Радыёстанцыя «Культура» стала пэўным гуртком элітарнасці. Тэматычнае разгалінаванне радыё дазволіла захаваць у эфіры музычнае і літаратурна-драматычнае вяшчанне, працаваць хоць і з меншай аўдыторыяй, але больш адрасна. Але ўсе тыя тэндэнцыі, якія былі характэрны для эфіру таго часу, паўплывалі, вядома, і на праграмную палітыку радыёканала «Культура», дзе таксама адмовіліся ад доўгіх маналагічных жанраў, аддаючы перавагу больш дынамічным фарматам. Акрамя таго, доля музычнага вяшчання была значна большая, чым літаратурна-драматычнага: «Музычны дэсерт», «Скрыжаванне», «Музычны калаж», «Музыка ночы», «Еўропа музычная», «Акадэмія гуку», «Рэтра-хіт», «Музычны радыётэатр», «Час музыкі», «Канцэрт», «Хіты на гады», «Хатняя філармонія», «Адвечная магія музыкі», «Канцэртная зала» супраць некалькіх праграм літаратурнага і літаратурна-драматычнага кірунку: «Літаратурная анталогія», «Сюжэт з лейтматывам», «Раніца з кніжкай», «Тэатр перад мікрафонам». Гэта таксама звязана з асаблівасцямі ўспрыняцця аўдыякантэнту і агульнымі тагачаснымі тэндэнцымі.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. Смирнов, В. В. Жанровая система радиожурналистики. История. Теория. Особенности функционирования / В. В. Смирнов. – Ростов-на-Дону, 2006.

## РАДЫЁКАНАЛ «КУЛЬТУРА»: ВЫТОКІ ПАПУЛЯРНАСЦІ

**Н. Р. Сцяжко**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

Радыёканал «Культура», які ўваходзіць у структуру Белтэлерадыёкампаніі з моманту свайго адкрыцця, 1 студзеня 2002 года, лічы-

ць сваёй місіяй інтэграцыю нацыянальнай беларускай культуры і мастацтва ў сусветную культуралагічную прастору. Яго мэта – паказаць, што Беларусь з’яўляецца неад’емнай часткай культурнага кода ўсяго чалавецтва. У эфіры прадстаўлена багатая палітра перадач, прысвечаная розным відам мастацтваў і народнай творчасці. У цяперашні час у эфіры знаходзіцца 30 арыгінальных перадач, падрабязна пра якія можна даведацца на сайце radiorultura.by/peredachi. Ен таксама мае багаты архіў, таму пры жаданні можна праслухаць перадачы, якія ўжо не ідуць у эфіры.

Важным з'яўляецца тое, што аўтарамі праграмы часта выступаюць не проста журналісты, але і мастацтвазнаўцы, спецыялісты ў пэўнай вобласці, што, несумненна павышае статус перадачы і яе мастацкую каштоўнасць, таму такі аўдыякантэнт вельмі прыцягальны для слухача.

Што дазваляе рабіць перадачу цікавай? Якія інструменты выкарыстоўвае аўтар для стварэння аўдыёпрадуктаў? У адрозненне ад тэлебачання, радыё не задзейнічае вобласць гледжання, таму такія важныя кампаненты экраннай мовы як кадр, ракурс, колер радые не можа ўзяць на ўзбраенне. У арсенале стваральніка радыёпраграмы толькі тыя інструменты, якія ўздзейнічаюць на слых – голас, шумы, музыка, рытм, мантаж. Усе гэтыя кампаненты ствараюць неабходную атмасферу ўспрымання аўдыятвора слухачом. Аўтары радыёканала «Культура» робяць гэта выдатна. Перадачы вельмі арганічныя, сбалансаваныя, з добрымі тэкстамі (сцэнарыямі) і выдатным гукавым аздабленнем. Таксама вельмі важным з’яўляецца разуменне сваёй мэтавай аўдыторыі. У радыёканала «Культура», у адрозненне ад іншых каналаў, яна шырокая па ўзростах – ад самых маленькіх, тых, што любяць «Вячэрнюю казку» да людзей шаноўнага ўзросту, інтэлектуалаў, аматараў класічнай музыкі, літаратуры і т. д.

Радыёканал «Культура» з’яўляецца добрым прыкладам для тэлеканала БТ3 па тэматычнаму складніку, якасці кантэнту і выкарыстанні беларускай мовы, таму многія радыёперадачы могуць быць адаптаваныя для тэлебачання, як напрыклад праграма «Суразмоўцы» Навума Гальпяровіча, прысвечаная беларускім пісьменнікам. Гэта, несумненна, узмацніла б якасны і іміджавы бок БТ3, тым больш, што ў рамках адной структуры – Белтэлерадыёкампаніі гэта не будзе вялікай праблемай. Яркай і канкурэнтнай перавагай радыё-

канала «Культура» з’яўляецца тое, што ўсе перадачы выходзяць на прыгожай, чыстай класічнай беларускай мове. Гэта з'яўляецца умовай працы для супрацоўнікаў радыёканала. Багатыя фонды, запісы з канцэртаў і спектакляў дазваляюць слухачу з любой «глыбінкі» дакрануцца да сапраўднага мастацтва («Канцэрная зала», «Класічны рэпертуар», «Натхнёныя музыкай», «Радыётэатр» і інш), а жыхару вялікага горада, наадварот, паслухаўшы перадачы пра фальклор («Гасцінец», «Беларуская этнафонія» і інш.), адчуць прыгажосць народнай музыкі, дакрануцца да вытокаў сваёй культуры.

Сёння, пасля 20 гадоў з дня свайго заснавання, радыёканал «Культура» здабыў свой стыль, непаўторны вобраз, выконвае найважнейшыя функцыі СМІ – адукацыйныя, рэкрэатыўныя, выхаваўчыя, патрыятычныя, таму з’яўляецца сапраўдным брэндам Белтэлерадыёкампаніі.

## ОБРАЗ ПИСАТЕЛЯ И ЛИТЕРАТУРЫ В ТЕМАТИЧЕСКИХ ПРОГРАММАХ РАДИОКАНАЛА «КУЛЬТУРА»

**Е. А. Петрусёва,**
научный руководитель – А. С. Давыдик
*Белорусский государственный университет*

Средства массовой информации играют огромную роль в формировании картины мира своей аудитории. Под «картиной мира» понимается совокупный мозаичный образ окружающего мира и его составляющих. Применительно к радиоканалу «Культура», по своей концепции отражающему и формирующему состояние и тенденции социокультурного пространства Беларуси для слушателей, нам представляется интересным определить способы концептуализации, формирования образа, одних из главных действующих лиц культурного поля страны – писателя и литературы.

Эмпирическую базу исследования нам составили выпуски трех программ, размещенные на сайте радиоканала, посвященные литературной тематике. Для анализа процедуры формирования образа были использованы семиотический и лексико-семантический методы.